*В.І.Стражаў,*
*міністр адукацыі*

# Ў добры шлях!

У час рэфармавання ўсяго грамадскага развіцця і адукацыйна-выхаваўчай сістэмы адбылася знамянальная падзея ў выдавецкай справе: заснаванне навукова-метадычнага часопіса "Гісторыя: праблемы выкладання". Дазвольце выказаць надзею, што новае выданне зойме адпаведнае месца ў вырашэнні праблем выкладання гісторыі, якія паўсталі перад гістарычнай адукацыяй і грамадствам.

Стварэнне часопіса — гэта крок наперад у спалучэнні тэорыі гістарычнай навукі, вопыту выкладання і выхавання маладога пакалення. Выкладчыкі сярэдняй і вышэйшай школы будуць мець магчымасць карыстацца здабыткам індывідуальнага вопыту, які з'яўляецца невычарпальнай крыніцай агульных намаганняў у дыдактыцы гісторыі. Разам з тым, часопіс павінен адыграць значную ролю ў павышэнні навукова-метадычных ведаў настаўнікаў. Распрацоўка новых даследчых і педагагічных тэхналогій, дыдактычных сродкаў і іх укараненне ў выкладчыцкую справу — галоўны накірунак дзейнасці выдання.

Жадаю часопісу высока несці асветніцкія ідэі і плённай працы на гэтым вызначальным шляху.



аiВ
Адукацыя і выхаванне

**Заснавальнік і выдавец —**
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**Выпуск 1 ' 97**
**I квартал**

# ГІСТОРЫЯ:
## праблемы выкладання



**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Л.В.Саламаха

І.І.Баргдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава

Бібліятэка БДПУ ім. М. Танка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У жніўні 1941 г. на пасадзе Вярхоўнага галоўнакамандуючага быў зацверджаны...

а) К.Е.Варашылаў;
б) Г.К.Жукаў;
в) І.В.Сталін.

## Историки об истории

*Vestigia semper adora**

**Цицерон**. *Об ораторе. 2, 15, 62.*

“Первый закон истории – ни под каким видом не допускать лжи; затем – ни в коем случае не бояться правды; не допускать ни тени пристрастия, ни тени злобы”.

**Тит Ливий.** *История Рима от основания города. Предисловие.*

“В том и состоит главная польза и лучший плод знакомства с событиями минувшего, что видишь всякого рода поучительные примеры в обрамлении величественного целого; здесь и для себя, и для государства ты найдешь, чему подражать, здесь же – чего избегать: бесславные начала, бесславные концы”.

**Семпроний Азеллион** (*по* **Авлу Геллию**. *Аттические ночи. V, 18, 8–9*).

“Мне кажется, что недостаточно рассказывать только о том, что произошло, но что нужно выяснить также смысл и логику, которые лежат в корне отдельных происшествий...”

* Чти всегда следы прошлого



# Арганізацыя навучання



## Старонкі падручніка

*Віталь Фамін, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ імя М.Танка;*
*Сяргей Паноў, метадыст Навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання*

### Гісторыя Беларусі. IX клас

### Тэма 10. Паварот да кансерватызму. Наспяванне крызісу (1965—1985)

#### 1. Змена палітычнага курсу

**Успомніце:**

1. Як і чаму менавіта так называўся палітычны курс у сярэдзіне 50-ых — сярэдзіне 60-ых гг.?
2. Якім было прозвішча кіраўніка КПБ у 1956—1965 гг. і чым ён вылучаўся сярод тых, хто быў на гэтай пасадзе да яго?

**Адыход ад папярэдняга палітычнага курсу**. У кастрычніку 1964 г. М.С.Хрушчоў, ініцыятар палітыкі лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця, быў зняты з пасады Першага сакратара ЦК КПСС. Кіраўніком Камуністычнай партыі, а фактычна і ўсёй савецкай дзяржавы, стаў Л.І.Брэжнеў, гады ўлады якога (1964—1982) атрымалі ў некаторых гісторыкаў вельмі яскравую назву “застою”.

У гэты перыяд схільнасць да вяртання на шлях сталінізму старанна хавалася, рабіўся выгляд, што ў краіне існую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

макратычныя формы ўлады. На самой справе ўся ўлада фактычна была ў руках партыйнага апарату, так званай ***наменклатурнай**** эліты, якая сфармавалася ў асобную, адарваную ад народа касту. Далейшае развіццё гэтага працэсу і прадвызначыла крызіс тагачаснай палітычнай сістэмы. Яе асаблівасцю стала непасрэднае прамое партыйнае кіраўніцтва эканомікай (так, планы пяцігодак прымаліся на з'ездах КПБ, у структуры парторганаў дзейнічалі аддзелы, якія кіравалі асобнымі галінамі эканомікі), а таксама наменклатурны прынцып фармавання кіруючых органаў у самой партыі і грамадскіх арганізацыях. Стварылася вялікая армія партыйна-дзяржаўных бюракратаў, якая кіравалася з Масквы.

Але і сярод партыйных кіраўнікоў былі сапраўдныя дзеячы, што не страцілі сувязь з народам. Такім быў Пётр Міронавіч Машэраў, які з 1965 па 1980 г. узначальваў рэспубліканскую партыйную арганізацыю.

**(?)** *Успомніце, калі і ў сувязі з чым вы сустракалі імя Машэрава.*

**Пункт гледжання**. У асабістых размовах П.М.Машэраў нярэдка выказваў незадаволенасць тым становішчам, якое складвалася ў кіраўніцтве партыяй і дзяржавай. Разам з тым ён, як і ўсе іншыя кіраўнікі, быў актыўным абаронцам таго рэжыму, з якога ён вырас. У час яго кіравання з-за ўкаранення ў шырокіх маштабах вялізных жывёлагадоўчых комплексаў і неабгрунтаванай меліярацыі пагоршылася экалогія.

**Змены ў грамадскім жыцці**. Беларусь, як адна з рэспублік СССР, спынілася ў сваім грамадска-палітычным развіцці, была прыпынена рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій, узмацнілася роля КДБ, адсутнічалі абвешчаныя ў Канстытуцыі БССР 1978 г. дэмакратычныя свабоды. Так, партыя кантралявала сродкі інфармацыі, друку. Людзі ў гэтых умовах усё ж такі знаходзілі іншыя шляхі для абмену думкамі і ідэямі, напрыклад у палітычных анекдотах, у выданні і распаўсюджанні самавыдавецкай літаратуры. Такія формы грамадска-палітычнага жыцця называліся нефармальнымі, і за імі пільна сачылі органы КДБ, якія займаліся выкарчоўваннем "іншадумства" і паступова зрасталіся з партыяй.

* Наменклатура — спіс кіруючых пасад, якія займаў той ці іншы чыноўнік пасля зацвярджэння партыйным органам.



**Гістарычны факт**. У 1982 г. Генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны былы старшыня КДБ Ю.У.Андропаў.

Большасць насельніцтва свае асабістыя імкненні звязвала з той будучыняй, якую малявалі палітыкі. Знешне складвалася ўражанне, што ўлада і народ знаходзяцца ў поўнай згодзе і ніякіх пагроз рэжыму наогул не існуе.

Для падтрымання такога ўражання як унутры краіны, так і за мяжой кіраўніцтва не шкадавала ні сіл, ні сродкаў. Неабходна было паказаць, што народ жыве паўнакроўным грамадска-палітычным жыццём і не толькі працуе, але і выказвае свае прыязныя пачуцці да партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне надавалася арганізацыі ўсенародных святкаванняў у дні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Першага мая, якія лічыліся рэвалюцыйнымі святамі. Такія святкаванні павінны былі дэманстраваць велічнасць перамог, да якіх вяла партыя, адданасць народа яе ідэалам. Дасягалася гэта правядзеннем масавых сходаў, мітынгаў, грандыёзных вулічных шэсцяў, у якіх прымала ўдзел большасць насельніцтва рэспублікі.

**Гістарычны факт**. У Мінску, напрыклад, у святочных дэманстрацыях удзельнічалі дзесяткі тысяч чалавек. Калоны афармляліся лозунгамі, транспарантамі, складанымі ўстаноўкамі, формы і змест якіх прадпісваліся партыйнымі органамі.

Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў 70-ыя — першай палове 80-ых гг. — з'ява складаная і пакуль што мала вывучаная. Яе складанасць абумоўлена тым, что ўзмацненне аўтарытарнага рэжыму ў гэтыя гады адбывалася ва ўмовах, калі эканоміка знаходзілася яшчэ на ўздыме і многія яго супярэчнасці часова згладжваліся. На аснове росту эканомікі, хоць і нязначна, адбывалася павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва, што служыла спрыяльнай базай для фармавання станоўчых адносін да палітыкі партыі.

**Гістарычны факт**. У 1979 г. савецкія войскі (у першую чаргу Віцебская паветрана-дэсантная дывізія) былі ўведзены ў Афганістан.

Гэта тлумачылася неабходнасцю дапамогі паўднёваму суседу СССР у яго барацьбе за самастойнае развіццё, хаця сапраўды гэта было падтрымкай толькі аднаго палітычнага рэжыму, які сімпатызаваў КПСС. У далейшым увод войск у Афганістан быў прызнаны палітычнай памылкай. Але амаль усе савецкія людзі тады падтрымалі такую палітыку партыі, таму што былі выхава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**(?)** *Цяжкую прамысловасць прынята абазначаць як групу "А", а лёгкую — як групу "Б". На аснове гэтых звестак зрабіце выснову аб накірунках у развіцці беларускай эканомікі.*

Адной з прыкмет крызісу з'явілася непавага да праблем экалогіі і нават іх ігнараванне ўвогуле.

**Гістарычны факт**. У БССР, якая займала меней 1 % ад усесаюзнай тэрыторыі, маючы каля 4 % ад насельніцтва СССР, у 1981 г. выраблялася ў маштабах краіны 52 % калійных угнаенняў, 22 % — хімічных валокнаў.

**(?)** *Як вы лічыце, у выніку чаго тэрыторыя Беларусі аказалася перанасычанай прадпрыемствамі хімічнай прамысловасці?*

Пасля эканамічнай рэформы павялічыўся аб'ём будаўніцтва, але доля ручной працы ў ім складала каля 57 %, а аб'екты здаваліся з недаробкамі. Развіваўся і транспарт, у прыватнасці, з 1984 г. у Мінску пачало дзейнічаць метро. Камсамол Беларусі прыняў удзел у будаўніцтве Байкала-Амурскай чыгуначнай магістралі (БАМа), якую называлі "будоўляй стагоддзя". Аднак народная гаспадарка развівалася ў многім неэфектыўна і не паспявала за ўзрастаючымі патрэбамі насельніцтва. У прыватнасці, павольна развівалася каляровае тэлебачанне, у пачатковым стане ў сярэдзіне 80-ых гг. знаходзілася вытворчасць і выкарыстанне відэатэхнікі, персанальных ЭВМ, людзі дзесяцігоддзямі чакалі ўстаноўкі кватэрных тэлефонаў.

**Ускладненне праблем сельскай гаспадаркі**. Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці ў 60-ыя — 70-ыя гг. адкрыла новыя магчымасці для пашырэння матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, укаранення ў сельскагаспадарчую вытворчасць дасягненняў навукі, тэхнікі, і перш за ўсё яе хімізацыі.

**Гістарычны факт**. З 1965 па 1985 г. колькасць штучных угнаенняў, якія ўносіліся ў глебу, павялічылася амаль у 20 разоў.

**(?)** *Разам з хімізацыяй праводзілася і меліярацыя, пра якую вы ўжо ведаеце. Да якіх вынікаў магло прывесці і прывяло празмернае выкарыстанне штучных угнаенняў і павелічэнне плошчы зямель з асушальнай сеткай?*

Сельская гаспадарка развівалася ў той час за кошт грошай з дзяржаўнага бюджэту, якія паслядоўна павялічваліся.

Аднак ні вынікі павелічэння сельскагаспадарчай вытворчасці, ні тэмпы росту прадукцыі сельскай гаспадаркі ні ў якое



параўнанне не ішлі з тэмпамі развіцця прамысловасці і не адпавядалі патрэбам рэспублікі і тым затратам, якія накіроўваліся ў гэтую галіну народнай гаспадаркі. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў разліку на душу насельніцтва зніжалася. У пачатку 80-ых гг. харчовае забеспячэнне рэспублікі пагоршылася. Сельская гаспадарка зноў аказалася ў передкрызісным стане.

**Гістарычны факт**. Рашэнне задачы забеспячэння насельніцтва харчовымі прадуктамі вырашалася праз стварэнне аграпрамысловага комплексу (АПК), задачай якога было аб'яднанне ў адзіны арганізм сельскай гаспадаркі і абслугоўваючых яе структур. Была нават распрацавана і прынята ў 1982 г. "Харчовая праграма СССР".

**Пункт гледжання**. Уся гэта "мітусня" вакол АПК абярнулася толькі стварэннем новых месцаў для бюракратыі, ад якой сельскай гаспадарцы было мала карысці.

Усё ж такі БССР у параўнанні з большасцю іншых рэспублік мела ў пачатку 80-ых гг. некалькі лепшыя паказчыкі развіцця сельскай гаспадаркі. Беларусь у тыя гады ў народзе назвалі "адкормачным цэхам Савецкага Саюза", таму што тут быў сканцэнтраваны, пачынаючы з канца 60-ых гг., адкорм буйной рагатай жывёлы, свіней, малочная жывёлагадоўля. Але забеспячэнне жыхароў рэспублікі мясам і мясапрадуктамі было не вельмі добрым.

Тыя велізарныя сродкі, якія выдаткавала дзяржава на паляпшэнне стану сельскай гаспадаркі, выкарыстоўваліся ва ўмовах каманднай эканомікі вельмі неэфектыўна. У большасці яны ішлі на падтрымку тых калгасаў, якія былі не ў стане выконваць дзяржаўны план, гэта значыць працавалі дрэнна, а іх эканоміка была стратнай. Усё гэта адбывалася ў выглядзе павышэння дзяржаўных закупачных цэн на мяса, малако, збожжа. Прадаваліся ж гэтыя прадукты па вельмі нізкай цане, што спрыяла сацыяльнай стабільнасці грамадства, бо гэтым хоць часткова кампенсаваліся даволі невялікія заробкі працоўных. Але так доўга працягвацца не магло, таму што розніца паміж высокай закупачнай і нізкай цаной пры продажы вяла да страт з боку дзяржавы, а ў дзяржавы, як вы ведаеце, "кішэнь" не безразмерная.

**(?)** *Як вы лічыце, у які артыкул дзяржаўнага бюджэту запісваліся сродкі, якія ішлі на падтрымку сельскай гаспадаркі?*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Высновы**. 1. Рэформа 1965 г. не прывяла да кардынальных змен у эканоміцы. Прамысловасць рэспублікі ў 70-ыя — першай палове 80-ых гг., як і раней, развівалася пераважна па экстэнсіўнаму шляху з перавагай вытворчасці групы "А" на аснове камандных метадаў і кіравання. 2. Сельская гаспадарка, нягледзячы на ўмацаванне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы, развівалася марудна, што было звязана ў асноўным з недахопамі дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне.

**Пытанні і заданні**:

1. Па якой прычыне эканамічная рэформа 1965 г. пацярпела няўдачу?
2. У чым сутнасць аграрнай праблемы, якая ўскладнілася ў пачатку 80-ых гг.?
3. Якія мерапрыемствы садзейнічалі абвастрэнню экалагічнай абстаноўкі?

## 3. Культурна-нацыянальнае жыццё рэспублікі (1965—1985)

**Успомніце**:

1. Што такое ідэалогія?
2. Якім чынам звязаны паміж сабой ідэалогія і культура?
3. Якая ідэалогія была характэрнай для тагачаснай палітычнай сістэмы?

**Партыйнае кіраўніцтва культурай**. У партыйным кіраўніцтве культурай назіралася пэўная цыклічнасць: перыяды ганенняў на інтэлігенцыю змяняліся перыядамі адноснай дэмакратызацыі, лібералізацыяй у культурным жыцці. Найбольш значная лібералізацыя ў культурным жыцці, якая настала пасля смерці Сталіна, ужо ў апошнія гады кіраўніцтва краінай М.С.Хрушчовым пачала змяняцца новым пахаладаннем. У адрас інтэлігенцыі пасыпаліся абвінавачванні ў размыванні ідэйных каштоўнасцей сацыялізму, парушэнні прынцыпу партыйнасці ў літаратуры і мастацтве.

**Гістарычны факт**. Далёка знаходзіцца ад Масквы Гродна, але справай гродзенскіх пісьменнікаў Васіля Быкава і Аляксея Карпюка займаўся сам старшыня КДБ СССР Ю.У.Андропаў. Камітэт Дзяржаўнай бяспекі яшчэ ў канцы 60-ых гг. прызнаў гэтых пісьменнікаў дысідэнтамі, г.зн. непажаданымі асобамі. У пісьме ў ЦК КПСС Ю.У.Андропаў паведамляў: "КДБ Беларусі мае даныя аб палітычна нездаровым настроі беларускіх пісьменнікаў — члена КПСС Карпюка і Быкава". А далей пайшлі мерапрыемствы партыі і КДБ па іх перавыхаванню і абясшкоджанню. А.Карпюка бюро Гродзенскага гаркома КПБ выключыла з партыі, В.Быкава абвінавацілі ў паклёпе на Савецкую Армію. Устанавілі тайны нагляд, праглядалася перапіска, праслухоўваліся тэлефоны.



Ужо ў другой палове 60-ых гг. рэзка ўзмацнілася ідэалагізацыя культурнага жыцця. У рэспубліцы клопатамі партыі на першае месца была пастаўлена марксісцка-ленінская адукацыя, якая павінна была забяспечыць выхаванне новага чалавека з яго камуністычным светапоглядам. Вывучаліся ў першую чаргу гісторыя КПСС і КПБ, палітычная эканомія, філасофія, навуковы камунізм, якія грунтаваліся на закасцянелых ідэалагічных догмах і партыйных прадвызначэннях.

Небяспека высвятлення рэальнай сутнасці гэтай ідэалогіі як сродку, які служыў абгрунтаванню і захаванню неабмежаванай улады партыі, магла зыходзіць толькі з асяроддзя інтэлігенцыі. Таму і ўзмацніўся партыйны кантроль ва ўсіх сферах культурнага жыцця.

Змагары за перамогу камуністычнай ідэалогіі і маралі ў грамадстве цалкам адхілялі грамадзянскія правы чалавека, у тым ліку ў адносінах да рэлігіі. Партыя аб'явіла непрымірымую барацьбу з рэлігійнай ідэалогіяй, яшчэ больш узмацніла так званую антырэлігійную прапаганду. На веруючых і служак рэлігійнага культу арганізоўвалі ганенні, штучна стваралі асяроддзе варожасці і нецярпімасці. Закрываліся цэрквы і забараняліся рэлігійныя аб'яднанні.

Каб забяспечыць укараненне камуністычнай ідэалогіі ў свядомасці людзей, асабліва моладзі, пайшлі па шляху пазбаўлення яе векавых традыцый, абрадаў і наогул гістарычнай памяці. Таму праз камсамольскія, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі настойліва ўкараняліся савецкія абрады і рытуалы: камсамольскія вяселлі, рэгістрацыя маладых у палацах і дамах шлюбу, урачыстыя рэгістрацыі немаўлят і інш. Гэта, мабыць, магло стаць нармальнай з'явай, калі б яно не проціпастаўлялася народным традыцыям і звычаям, якія лічыліся ў той час перажыткам мінулага.

**Гістарычны факт**. На XXIV з'ездзе КПСС у 1971 г. Генеральны сакратар ЦК КПСС Л.І.Брэжнеў заявіў, што ў краіне ўжо "ўзнікла новая гістарычная супольнасць людзей — савецкі народ".



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**(?)** *Паспрабуйце параўнаць паміж сабой дзве супольнасці: беларуская нацыя і савецкі народ. Што тут агульнага, а што рознага?*

Беларусь у гэтыя гады стала ўзорам найбольш паспяховага знішчэння культурна-нацыянальнай годнасці нацыі. Мова нацыі амаль перастала існаваць і жыла толькі ў нацыянальнай літаратуры ды ў некаторых сродках масавай інфармацыі. Хутка скарачаліся выданні — беларускамоўнай літаратуры і перыядычныя. Фактычна гэта было практычнае ўвасабленне на Беларусі курсу партыі па фармаванню новай гістарычнай супольнасці людзей — савецкага народа.

**(?)** *Успомніце, у які перыяд гісторыі падобныя падзеі адбываліся на Беларусі.*

**Развіццё народнай адукацыі**. Народная адукацыя развівалася ў гэтыя гады пад непасрэдным уплывам працэсаў, якія характарызавалі ўнутрыпалітычнае жыццё краіны: стварэнне ўражання велічнасці планаў і здзяйсненняў партыі ў імя народа і прагрэсу, паспяховага будаўніцтва камунізму. А такія планы непазбежна патрабавалі і развіцця адукацыі.

**Гістарычны факт**. Галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі з'явіўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, які адбыўся ў рэспубліцы ў другой палове 70-ых гг. Гэта прывяло да хуткага росту адукацыйнага ўзроўню асноўнай масы насельніцтва, і ў першую чаргу моладзі. Амаль усе выпускнікі VIII класаў агульнаадукацыйнай школы працягвалі вучобу для атрымання сярэдняй адукацыі, якая складала тады 10 гадоў. Калі ў 1965 г. сярэднюю адукацыю ў БССР атрымалі 50 тыс. чалавек, то ў 1985 г. — каля 170 тыс.

Усе школы перайшлі на кабінетную сістэму, пашырылася выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання. Абнавіўся змест і метады навучання ў малодшых класах, а пачатак сістэматычнага выкладання асноў навук быў перанесены з V ў IV клас.

Разам з атрыманнем адукацыі, вучні рыхтаваліся ў працэсе вучобы да ўдзелу ў прадукцыйнай працы ў розных галінах народнай гаспадаркі, што адбывалася на прадпрыемствах, у арганізацыях, калгасах і саўгасах, міжшкольных вучэбна-вытворчых кабінетах, вучнёўскіх вытворчых брыгадах, школьных майстэрнях. Але скарачэнне фінансавых сродкаў асуджала народную адукацыю на непазбежнае адставанне ў развіцці вучэбна-матэрыяльнай базы, асабліва ў справе яе камп'ютэрызацыі. Узмацненне ў гэтыя гады цэнтралізаванага кіраўніцтва краінай



вяло да ўшчамлення нацыянальных інтарэсаў у справе адукацыі. Нават вызначэнне колькасці гадзін на вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі ажыццяўлялася ў Маскве.

У жыцці і дзейнасці школы адмоўны ўплыў аказваў фармалізм, які асабліва ўзмацніўся ў сувязі з патрабаваннямі даць усім маладым людзям сярэднюю адукацыю. Школы і настаўнікі вымушаны былі цягнуць да атэстата аб сярэдняй адукацыі і тых, хто не імкнуўся да гэтага ці наогул быў нядольны асвоіць праграму сярэдняй школы.

У 70-ыя гг. перайшлі на падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых з сярэдняй адукацыяй у прафтэхвучылішчы. У 1985 г. у параўнанні з 1965 г. больш як у 3 разы павялічылася ў іх колькасць навучэнцаў. Павялічыўся выпуск спецыялістаў і з вышэйшай адукацыяй. У рэспубліцы ў 1985 г. дзейнічала 33 ВНУ, у якіх навучалася 182 тыс. студэнтаў. Увогуле вышэйшая і сярэдняя спецыяльныя школы па большасці спецыяльнасцей поўнасцю забяспечвалі патрэбы рэспублікі ў неабходных кадрах спецыялістаў. Іх выпуск з 1960 па 1985 г. павялічыўся больш як у 3 разы.

Аднак дасягнуты ў кароткі час значны ўздым адукацыйнага ўзроўню моладзі і ўсяго насельніцтва не заўсёды суправаджаўся павышэннем якасці спецыялістаў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

**Месца навукі ў жыцці беларускага грамадства**. Хуткія тэмпы развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу ў пасляваенныя гады сталі рашаючым фактарам агульначалавечага прагрэсу. Кіруючыя колы як СССР, так і Беларусі ў гэтыя гады таксама прызнавалі навуку важным фактарам сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. На мэты навукі з дзяржаўнага бюджэту выдзяляліся немалыя сродкі, што вяло да хуткага росту колькасці навуковай інтэлігенцыі. Вядучым цэнтрам навукі ў рэспубліцы як і раней з'яўлялася АН Беларусі.

Важнае значэнне мела дапамога Беларусі з боку навуковых цэнтраў СССР. Яшчэ ў 50-ыя гг. у Мінск на пастаянную работу прыехалі вучоныя: фізікі і матэматыкі М.Ельяшэвіч, А.Сеўчанка, В.Сцяпанаў, М.Яругін і інш. Іх дзейнасць адыграла важную ролю ў развіцці ў рэспубліцы новых навуковых напрамкаў, падрыхтоўцы мясцовых кадраў вучоных.

**Гістарычны факт**. Па некаторых напрамках навуковых распрацовак былі дасягнуты вынікі, якія атрымалі прызнанне не толькі ў СССР, але і за яго мяжой. Акадэмік АН БССР



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

М.Мацэпура за распрацоўку і ўкараненне ў сельскагаспадарчую вытворчасць высокаэфектыўнай тэхналогіі механізацыі забалочаных зямель у 1962 г. стаў лаўрэатам Ленінскай прэміі. Такога ж звання ўдастоіліся акадэмік АН БССР М.Ельяшэвіч за навуковыя працы ў галіне фізічных навук (1966), акадэмік АН БССР У.Платонаў за работы ў галіне матэматыкі (1978).

На прадпрыемствах Беларусі сталі выпускацца станкі асабліва высокай дакладнасці. Выраблялася прадукцыя, якая служыла выкарыстанню энергіі атама, засваенню космасу. А беларусы Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак сталі сусветнавядомымі лётчыкамі-касманаўтамі СССР, якія сваімі касмічнымі палётамі ўнеслі непасрэдны ўклад у засваенне космасу.

Аднак застой у грамадстве аказваў адмоўны ўплыў і на навуку, якая была праваднікам партыйнай ідэалогіі, забяспечвала тэарэтычнае абгрунтаванне неабходнасці кіруючай ролі Камуністычнай партыі.

**Узмацненне прынцыпу партыйнасці ў літаратуры і мастацтве**. Ва ўмовах пераходу з канца 60-ых гг. наменклатурнай улады да новых абмежаванняў і ідэалагічных ганенняў, беларуская літаратура перажывала складаны час свайго развіцця. У партыйных патрабаваннях да літаратуры на першае месца вылучалася ідэйная накіраванасць твораў, іх адпаведнасць установкам партыі па камуністычнаму выхаванню чалавека.

Таму, калі гаварыць аб здабытку беларускай літаратуры гэтых гадоў, то трэба адзначыць, што ён змяшчаўся перш за ўсё не ў агульным яе развіцці, а ў тых асобных, сапраўды праўдзівых творах, якія нараджаліся насуперак усялякай партыйнасці літаратуры. Імкненне да асвятлення рэальнай праўды жыцця, праўды гісторыі асабліва ўласціва было беларускай літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну. Жудасныя факты недаверу да людзей, якія ў час вайны апынуліся ў акупацыі, прывёў С.Грахоўскі ў дакументальнай аповесці "Зона маўчання". Падзеі вайны пісьменнікі 70-ых гг. пачалі разглядаць у кантэксце часу, мінулага і сённяшняга дня. Найбольш яскрава гэта адлюстравалася ў рамане В.Быкава "Кар'ер". Пісьменнік пераканаўча даказаў: каб пазнаць паводзіны чалавека на вайне, трэба ведаць пра яго жыццё ў мірны час. Выйшла "Хатынская аповесць" А.Адамовіча, у якой сучаснасць і былыя партызанскія справы пададзены ў глыбокім філасофскім асэнсаванні вайны наогул. Апавяданне аб зверствах фашыстаў на зямлі беларускай — у кнізе А.Адамовіча, Я.Брыля, У.Калесніка "Я з вогненнай вёскі". Здабыткам беларускай літаратуры пра сучаснасць з'явіўся раман У.Караткевіча "Чорны замак Альшанскі", у якім пісьменнік часта звяртаецца і да гісторыі, але для таго, каб раскрыць пераемнасць мінулага і сённяшняга, паказаць перспектыву на будучае.



Значна пашырылася ў гэтыя гады літаратура пра У.І.Леніна, на тэму рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. З'явіліся аповесці І.Шамякіна "Браняпоезд "Таварыш Ленін", "Лёс майго земляка", апавяданне П.Броўкі "Разам з камісарам" і інш. Вядучай тэматыкай заставаліся праблемы Вялікай Айчыннай вайны. Плённа гэту праблематыку распрацоўвалі І.Шамякін, І.Мележ, І.Навуменка і інш. Іх творы характарызуюцца яскравасцю вобразаў, дакументальнай праўдзівасцю, высокім мастацкім узроўнем.

Але большасць пісьменнікаў ва ўмовах узмацнення партыйнага дыктату вымушана была прыстасоўвацца да новых абставін і падтрымала курс партыі ў галіне культуры.

У 70-ыя гг. найбольш вядомай стала дзейнасць кінастудыі "Беларусьфільм", прысвечаная ваеннай тэматыцы (шматсерыйная тэлевізійная стужка "Руіны страляюць...", "Альпійская балада" рэжысёра В.Сцяпанава і інш.).

**(?)** *Якія творы кінастудыі "Беларусьфільм" вы бачылі?*

У беларускай музыцы вядомымі сталі такія оперы Ю.Семянякі, як "Зорка Венера", "Францыск Скарына" і інш. Але большасць кампазітараў імкнулася пазбегнуць сучаснай тэматыкі, бо тут трэба было падпарадкоўвацца партыйным патрабаванням.

У беларускім выяўленчым мастацтве панавала ў той час лeнініяна. Былі створаны і тэматычныя карціны пра вайну, напрыклад "Пакаранне смерцю", "Партызанская мадона" М.Савіцкага. Ім жа быў створаны цыкл карцін "Лічбы на сэрцы", прысвечаны вязням фашысцкіх лагераў смерці. Сярод манументальнага мастацтва асабліва вылучаюцца мемарыяльныя комплексы "Хатынь" і "Курган Славы", адкрытыя ў 1969 г. (аўтары А.Глебаў, С.Селіханаў і інш.), комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", помнікі Якубу Коласу (1972, скульптар З.Азгур) і Янку Купалу (1972, скульптары А.Анікейчык, Л.Гумілеўскі) у Мінску.

Асобнае месца ў выяўленчым мастацтве займае творчасць Аляксандра Ісачова, арыгінальнасць і талент якога прабівалі сабе шлях толькі праз замежжа і толькі пасля яго смерці. А



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсё таму, што як мастак ён сфармаваўся пад уплывам розных мадэрнісцкіх плыняў і з-за гэтага не ўпісваўся ў прызнаныя ў афіцыйных колах рамкі. Не зрабілі ўражання на цэнзараў ад культуры нават такія яго карціны, як "Апостал Пётр", "Малітва", "Нацюрморт з люстэркам" (з серыі "Магія"), "Выгнанне з раю" і інш., а іх было звыш 500. І ўсё гэта ён паспеў стварыць за сваё кароткае жыццё, якое абарвалася ў 32 гады.

Асабісты лёс вядомага ўжо вам Марка Шагала не быў такі трагічны, як у А.Ісачова. Ён пражыў доўгае жыццё, у асноўным у Францыі, куды паехаў у першыя гады пасля рэвалюцыі і памёр у 1985 г. Але прызнанне ў сябе на Радзіме атрымаў толькі ў апошнія гады, калі краіна стала на дэмакратычны шлях развіцця.

**Высновы**. Культура Беларусі ў 70-ыя — пачатку 80-ых гг. зрабіла новы крок у сваім развіцці, асабліва праз творчасць яе таленавітых сыноў і дачок. Аднак увогуле яна знаходзілася пад прамым партыйным уздзеяннем, што сказалася на адлюстраванні дзеячамі савецкай рэчаіснасці і недастатковасці ўвагі да нацыянальна-культурных асаблівасцей беларускага народа. Не падтрымліваліся на Беларусі і сучаснае мастацтва з яго рознымі мадэрнісцкімі плынямі.

**Пытанні і заданні**:

1. Прывядзіце прыклады барацьбы партыі з іншадумствам у галіне літаратуры.
2. У чым заключаліся поспехі і недахопы развіцця народнай адукацыі?
3. Назавіце імёны і творы найбольш вядомых дзеячаў беларускай культуры другой паловы 60-ых — першай паловы 80-ых гг.
4. Растлумачце сутнасць тэрміна "ідэалагізацыя культурна-нацыянальнага жыцця".

## Пытанні і заданні да тэмы 10

1. Растлумачце, што азначае тэрмін "наменклатура" ў савецкай гісторы.
2. Чым можна растлумачыць зніжэнне актыўнасці народа ў адносінах да грамадска-палітычнага жыцця ў 70-ыя — першай палове 80-ых гг.
3. Ці можна лічыць асобу П.М.Машэрава выключэннем з правіл наменклатурнай сістэмы? Для адказу на пытанне трэба



будзе параўнаць гэту асобу як партыйнага кіраўніка і як простага чалавека, а таксама параіцца з настаўнікамі або бацькамі.
4. У гады так званага "застою" ў канцы 70-ых — пачатку 80-ых гг. у ідэйным кантролі над грамадскім жыццём узмацняецца роля КДБ. Растлумачце прычыны гэтага. Правядзіце гістарычныя паралелі з аналагічным працэсам на Беларусі ў 30-ыя гг. Якую выснову з такога гістарычнага параўнання можна зрабіць?
5. Па якому шляху (экстэнсіўнаму ці інтэнсіўнаму) развівалася народная гаспадарка Беларусі ў другой палове 60-ых — пачатку 80-ых гг.? Свой адказ абгрунтуйце.
6. Ахарактарызуйце творчасць дзеячаў літаратуры і мастацтва ў другой палове 60-ых — пачатку 80-ых гг.
7. Паспрабуйце правесці гістарычныя паралелі паміж сістэмай адукацыі ў пачатку 80-ых гг. і сёння.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ